ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР

23 чэрвеня 1994 года
№ 5 (1710)

● ЗАПРАШЭННЕ НА КАВУ

## «Я ДАРУ ЛЮДЗЯМ ДОБРЫ НАСТРОЙ...»



«Кубачак кавы, калі ласка»,— пачулася, напэўна, ужо ў соты раз на дзень. І ў соты раз напоўніўся кубачак араматнай кавай, мушу вас запэўніць, нікольki не горшай за папярэднія 99. Наогул жа, гэтых кубачкаў-куфэрачкаў у Цітовай Тацціяны Мікалаеўны — галоўнага кававара БДУ — за больш чым восем гадоў працы — незлічоная колькасць.

Заўсёды прыемная ўсмешка і па-гаспадарску ветлівае «Калі ласка» падкупляе. І здаецца (а можа так яно і ёсць) сам выгляд гаспадыні як нельга лепей дапасуецца да добразычлівай атмасферы «Кавярні цёці Тані» — так ласкава называюць гэтае ўтульнае месца жыхары шэрага змрочнага будынка з сухой назвай «Хімфак».

Усё цячэ, усё змяняецца і, як лічыць сама Тацціяна Мікалаеўна, заўсёды да лепшага. Вось і да яе кавярні дакрочылі змены — пасля сямігадовага існавання кавярню адрэстаўравалі і вось ужо год як на яе — люба глянуць. У люстэрках на столі адбіваюцца заўсёды чыста выцертыя сталы і бліскучая падлога. На абцягнутых матэрыяй сценах, відаць, з густам напісаныя карціны. Карацей — кавярня ў лепшым сэнсе слова. Але самае галоўнае — за стойкай. Кава ў цёці Тані — цудоўная. Без яе праца — не праца, і жыццё — не жыццё. Гэтак жартуюць наведвальнікі, твары якіх пры ўзгадцы аб цёці Тані мягчэюць, быццам узгадка зварухнула ў іх душы цёплы ўспамін з дзяцінства.

— Я дару людзям добры настрой. Здавалася, ветлівасць і дружалюбнасць, ды й кубачак кавы — дробязь, якую яны тут атрымліваюць. А ці не з іх складаецца нашае жыццё?! — рытарычна пытаецца Тацціяна Мікалаеўна.

Дый сапраўды, у веданні чалавечых характараў ёй не адмовіш. Паспрабуйце знайсці падыход да незнаёмага чалавека, які толькі што падышоў да стойкі. Напэўна, тут і мэтру Карнегі прыйшлося добра папакпець. Тацціяна Мікалаеўна робіць гэта кожны дзень з паражаючай лёгкасцю.

— **У чым сакрэт?** — пытаюся я.

— Уявіце, падышоў чалавек шарэй за хмару. Слова за слова — глядзіш, і павесялеў, адпачнуў.

— **Адкуль сілы на ўсё бераце?**

— Ніколі над гэтам не думала. Напэўна, адваротная сувязь дзейнічае. Добрых людзей больш за злых — я ў гэтым упэўнена, а таму ўдзячнасць ад іх большая. Я ж імкнуся ствараць добры настрой усім і калі бачу, што гэта ўдаецца — на душы становіцца лёгка.

— **І цяжка ніколі не бывае? А калі за вашу ветлівасць вас жа і абразяць?**

— Ніколі не злую. Бывае і такое. Значыць, такі чалавек — можа ад гэтай абразы яму палягчэе. На сваё «худо» нікому не скарджуся — што маё, тое маё. Ведаеце, за чорнай паласой заўсёды ідзе белая. А калі здаецца «чорная паласа», нікога ёй не абцяжарваю — у жыцці і так зашмат чорнай фарбы.

— **Дарэчы, пра фарбы. Кава таксама чорная?**

— А гэта не важна. Галоўнае, каб смачная была.

— **А самі каву п'яце?**

— А як жа.

Са шкадаваннем гляджу на гадзіннік — пара. Дый да стойкі падышлі новыя наведвальнікі: «Кубачак кавы, калі ласка». Развітваючыся з гаспадыняй добрага настрою, не забудзьце падзякаваць ёй, каб пачуць у адказ: «Заходзьце зноў»...

**Тацціяна Мікалаеўна частавала кавай**
**Юрася КАРМАНАВА**

*На здымку: гаспадыня кавярні.*
*Фота Юрася ЛЯШКЕВІЧА.*

● ВЕДАЙ НАШЫХ!

## З ЖЫЦЦЯ СТУДЭНЦКАГА КЛУБА

**У студэнцкі клуб БДУ я, прызнаюся, ішла з «крамольнай» думкай: «Якая ў нашыя дні можа быць грамадская актыўнасць? Ці ж да жартаў, спеваў ды скокаў? Час не той. Хаця б галоднаму студэнту засвоіць неабходны мінімум па спецыяльнасці». Але пасля размовы з дырэктарам клуба Уладзімірам Міхайлавічам Макарэвічам у галаве звінелі словы з верша Эдуарда Багрыцкага: «Не погибла молодость! Молодость жива!» (прабачце, што на рускай мове, але гэтыя радкі вельмі трапна характэрызуюць мой стан).**

**І на самой справе, інакш не скажаш. Бо дзейнасць студэнцкага клуба такая цікавая і разнастайная, што ў кароткім матэрыяле можна расказаць толькі аб найважнейшых дасягненнях года.**

**У студзені каманда Клуба вясёлых і знаходлівых БДУ была запрошана ў Сочы для ўдзелу ў тэлефестывалі клубаў КВЗ. Нашы студэнты паказалі сябе дастаткова вясёлымі і знаходлівымі, каб іх уключылі ў конкурс КВЗ краін-членаў СНД. Каманда дайшла аж да чвэрцьфінала. На жаль, там перамагчы не атрымалася. Але для дэбютантаў і гэта нядрэнна. Галоўнае — з'явіўся спартыўны азарт і жаданне абавязкова перамагчы ў наступным годзе. Поспехаў вам, вясёлыя і знаходлівыя!**

**Усё новых і новых вяршынь дасягае наш славуты фальклорны ансамбль «Неруш». У гэтым годзе ён стаў лаўрэатам Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці «Спадчына». Менавіта гэтаму калектыву было даверана прадстаўляць нашу сталіцу на Міжнародным фестывалі фальклора, які праходзіў з 15 па 21 чэрвеня ў Пінску.**

**Аркестр народных інструментаў БДУ ў маі гэтага года прыняў удзел у Міжнародным студэнцкім музычным фестывалі ў Францыі. Выступалі музыканты з вялікім поспехам і былі запрошаны прыехаць таксама і ў наступным годзе.**

**Не адстаюць ад моладзі і выкладчыкі нашага універсітэта. Народны хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў БДУ атрымаў дыплом I ступені на рэспубліканскім фестывалі народнай творчасці «Спадчына». А спеўны гурт выкладчыкаў і супрацоўнікаў «Тутэйшая шляхта» стаў дыпламантам Рэспубліканскага фестываля народнай музыкі ў Паставах.**

**Усе мастацкія калектывы БДУ: і хор выкладчыкаў і супрацоўнікаў, і гурт «Тутэйшая шляхта», і студэнцкая харавая капела, і аркестр народных інструментаў, і ансамбль танца «Крыжачок» — усіх нават не пералічыць — на працягу навучальнага года прымалі актыўны ўдзел у мерапрыемствах, прысвечаных 50-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, радуючы сваім майстэрствам ветэранаў вайны не толькі нашага горада, але і ўсёй рэспублікі. А 3 ліпеня ўсе калектывы будуць выступаць на вуліцах і плошчах горада-героя Мінска.**

**Канцэртная дзейнасць студэнтаў не спыніцца нават у час канікул. У ліпені ансамбль «Неруш» паедзе ў Нарвегію на міжнародны фестываль фальклору, а народны ансамбль танца «Крыжачок» прыме ўдзел у Міжнародным фестывалі, які адбудзецца ў Італіі.**

**Як бачыце, жыццё студэнцкага клуба, насуперак усім цяжкасцям, бурна кіпіць кругла год. А тым, хто хоча быць заўсёды маладым, клуб гаворыць: «Сардэчна запрашаем!»**

**Ганна НЯХАЙ**

● ЮБІЛЕІ

## ЗАЗІРНІЦЕ Ў БІБЛІЯТЭКУ

У 1994 годзе споўнілася 25 гадоў з пачатку выдання часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага Універсітэта».

Фундаментальная бібліятэка БДУ далучаецца да віншавання часопіса і жадае плённай працы ў будучым. На працягу чвэрці стагоддзя бібліятэка атрымоўвала ўсе чатыры серыі часопіса, якія захоўваюцца поўнымі гадавымі камплектамі ў кнігасховішчах бібліятэкі і прадстаўлены да паслуг чытачоў. Бібліятэка таксама адзначыла гэтую дату і з гэтай нагоды падрыхтавала некалькі выстаў па матэрыялах часопіса... Адна з іх была падрыхтавана аддзелам рэдкай і каштоўнай кнігі «Веснік БДУ (да 25-годдзя з пачатку выдання часопіса)». На выстаўцы экспанаваліся ўсе серыі і выпускі першага года выдання (1969 г.), тут жа былі прадстаўлены юбілейныя выпускі (1971, 1981, 1991 г. г. выдання), дзе чытач змог пазнаёміцца, як за гэтыя дзесяцігоддзі развівалася навука таго ці іншага факультэта або з яго гісторыяй. У рубрыцы часопіса і раздзеле выстаўкі «Нашы юбіляры» можна даведацца пра жыццё і творчую дзейнасць прафесарска-выкладчыцкага састава БДУ.

«Веснік БДУ»— навукова-тэарэтычны часопіс, які сістэматычна друкуе па розных галінах ведаў навейшыя даследванні вучоных універсітэта і рэспублікі.

Хочацца расказаць яшчэ і аб тым, што аддзел рэдкай і цэннай кнігі вядзе летапіс выданняў БДУ.

Сюды ўваходзяць: часопіс «Веснік БДУ», газета «Беларускі універсітэт», навуковыя працы БДУ і выданні прафесарска-выкладчыцкага саставу БДУ.

Газета «Беларускі універсітэт» пачала друкавацца ў пачатку 20-х гадоў нашага часу, толькі друкавалася яна на працягу многіх гадоў пад рознымі назвамі. З 1954 года яна пачала выходзіць пад назвай «Беларускі універсітэт», яе гадавыя падшыўкі з гэтага часу захоўваюцца ў аддзеле рэдкай кнігі, а вось да 1954 года камплекты газеты знаходзяцца ў газетным аддзеле Пецярбургскай Публічнай бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына.

Карэспандэнтамі газеты з'яўляюцца выкладчыкі і студэнты БДУ, якія ў сваіх артыкулах асвятляюць праблемы вучобы, навуковай працы, спорту, быту, адпачынку і г. д.

Аддзелам сабрана калекцыя навуковых прац і выданняў прафесарска-выкладчыцкага саставу універсітэта, якая налічвае каля 2-х тысяч экземпляраў.

Шаноўныя чытачы, наведвайце часцей бібліятэку БДУ. Усё тут прадстаўлена да вашых паслуг.

**Загадчыца аддзела рэдкай кнігі**
**Л. П. МІЦКЕВІЧ.**

## ДАІ ПАВЕДАМЛЯЕ

За пяць месяцаў 1994 года здзейснена 257 дарожна-транспартных здарэнняў. Пры гэтым загінула 25, паранена 288 чалавек.

Па віне вадзіцеляў транспартных сродкаў — 103 дарожна-транспартных здарэнні. Пры гэтым 24 здарэнні здзейснены ў нецвярозым стане. Па віне індывідуальных уладальнікаў здзейснена 6 дарожна-транспартных здарэнняў, па віне пешаходаў — 129.

21 вадзіцель пры здзяйсненні дарожна-транспартных здарэнняў зніклі з месца здарэння. Пры гэтым загінула 2, паранена 20 чалавек.

За красавік-май 1994 года работнікамі ДАІ затрыманы і аштрафаваны наступныя студэнты БДУ:

пешаходы: Буранкоў А. В., Некрашэвіч Д. С., Шароў А. Я., Забела Л. Я., Сікорскі Д. В., Купрыенка С. В., Бітэль В. Ю.;

уладальнікі індывідуальных транспартных сродкаў: Котрус П. Н., Лукашоў А. А., Башун А. В., Брылеўскі А. А., Рабок Я. А., Кучынскі Ю. П., Крываруша Ю. П., Высоцкі С. С.

Пешаходы і вадзіцелі, строга прытрымлівайцеся правіл дарожнага руху! Шануйце сваё здароўе і здароўе сваіх блізкіх.

**Ст. госаўтаінспектар ДАІ Маскоўскага РАУС**
**В. АДАМОВІЧ.**

# ЛЯ-ЛЯ-ФА!

## СТАРОНКА ДЛЯ ЗАКАХАНЫХ

## АЙНУР

### Любовная лирика студента-физика

***Посвящается Аннушке, девушке с грустными глазами***

Прощай, прощай моя любовь.
Ушла мечта, исчезли грёзы,
Остановилась в жилах кровь,
Застыла, превращаясь в слёзы.

Нет, я, конечно, не умру
И, может, счастлив даже буду.
Но, видит Бог, свою звезду,
Тебя, мой ангел, не забуду.

Я в своём сердце пронесу
Твой чудный образ сквозь года.
Лишь об одном тебя прошу:
Приснись мне хоть бы иногда.

* * *

**Весна! И солнце вновь сияет,**
**И снова птицы прилетают,**
**Хотя зачем летят — не знают,**
**Ведь скоро им назад лететь.**

**Весна! Тепло и припекает.**
**Хотя дожди еще бывают,**
**Но куртки все уже снимают —**
**Наверно, не хотят потеть.**

**Весна! И вновь живет природа:**
**Красавца праздник и урода.**
**И знать себя даёт порода,**
**И брачный начался сезон.**

**Весна! Деревья дятел точит.**
**Длиннее день, короче ночи.**
**И зубр ругательства бормочет:**
**Вообразил, что он бизон.**

**Весна! И листья вырастают**
**(Они пока не опадают),**
**И мне они напоминают**
**Г—ча усы.**

**Весна! И девушки шалеют,**
**И ни о чем они не знают,**
**И даже юноши краснеют,**
**И молча смотрят на часы.**

* * *

Ты уже никогда не услышишь мой смех:
Я себя хороню, хотя это и грех.
Впрочем, я уже мёртв, мне уже не помочь,
И отныне всегда моим днём будет ночь.
Как холодная тень в тихой призрачной тьме,
Ночью буду бродить и мечтать о тебе.
Я не буду топиться и вены кромсать,
Мне противно давиться, мне на всё наплевать.
Через год, через два, может быть, никогда
Вспомнишь ты и поймешь мою грусть и тогда
Ты меня позовешь, но услышишь мой смех.
И тогда ты поймешь, кто был лучший из всех.
И, оставшись одна, ты тихонько всплакнёшь,
Вспомнишь всё и тогда свою жизнь проклянешь.

* * *

**Когда тебе плохо, и не хочется жить,**
**И нет желанья веселиться и пить,**
**Пуста душа и пуст карман,**
**Ты можешь прийти к нам.**

**Ты идешь по городу — и слёзы в глазах:**
**Ты счастлива была лишь в сказочных снах.**
**Ты любишь гулять среди желтых полей,**
**Но не любишь никогда никого из людей.**

**Ты выслушивала ложь и откровенную лесть,**
**Но никто не стал**
**счастливей от того, что ты есть.**
**На твоём лице улыбка**
**сквозь лёгкую грусть —**
**Эту каменную ласку ты знаешь наизусть.**

**Твои мысли текут, но глаза пусты:**
**В них не видно отражения высокой мечты.**
**И, зная это, прячешь их ты**
**За длинными ресницами дивной красоты.**

* * *

***Неотправленное письмо абоненту №      , приславшей своё стихотворное объявление в рубрику «Клуб знакомств».***

Твой стиль изящества
(ну право) не лишен,
Но, кажется, эмоций много в нём,
Которые вредить нам могут часто.
На суд людской их выносить опасно.
А ты, отчаявшись в свои 17 лет,
Как будто постарев от горя, зла и бед,
Пытаешься толпу разжалобить стихами,
Которые достойны быть прослушаны богами.
Стихи твои прочтя вечернюю порою,
Я плачу: вновь встают передо мною
«Дианы грудь, ланиты Флоры»
Чело и «ножки Терпсихоры».
И голову склоняю я пред ними
А мысли мои, рифмою гонимы,
К газете возвращаются и снова
Стихи читаю я, и мне не ново
Подобные читать посланья, но
Жаль, что мне их писать не суждено:
Ведь с той поры, как взор
Я обратил к твоему посланью,
С собою что поделать я не знаю и страдаю...

Ах, что за рифма!
Что за дивный слог!
Я был бы счастлив,
Если б так же смог
Легко и просто, росчерком пера
Всё описать; ты мне урок дала
Таланта и фантазии ума.
И я к твоим стопам губами припадаю
Как описать себя мне — я не знаю.
А впрочем, как бы я не написал
Всё хуже будет, чем на самом деле.
Ну, я начну, а то не кончить этот псалм
Мне и к концу недели.
Итак: я молод, не урод,
Мой крупный нос, красивый рот
Нередко девушек в смущение приводят,
И соки жизни вверх и вниз по телу бродят.
Мне скоро 19 будет...
И наступившая весна
Во мне любви флюиды будит
И жду я, что придет она...
Ты не подумай, будто я,
Мысль похотливую тая;
Пытаюсь девушкам в любовники набиться
Или тем более в мужья...
Нет, нет, не в том мечта моя—
Ищу я друга, чтобы вместе веселиться,
И хоть я занятой весьма,
Но буду ждать твоего письма,
И время найду тебе ответить.
Ах, поскорее шли ответ —
Свою поэму иль сонет,
Чтоб можно было рифму в нем заметить
И рифмой на него ответить.
В странице цвета молока
Я не «прощай» пишу — «пока»,
Надеюсь на письмо я или встречу.
И если не напишешь ты —
Завянут свежие цветы
И я себя убью иль покалечу.

P. S. ***Прошу тебя, не надо слёз***
***восторга или умиленья—***
***Письмо писал я не всерьёз,***
***А просто так, для развлеченья.***



*Малюнак Анатоля Пляскіна.*

● ЯКІЯ МЫ?

# КРЫЛЫ „MONTANA“ ЦІ КРЫЛЫ КАХАННЯ?

Гляджу я часам на парачкі закаханых, якія хутка, не затрымліваючыся ні на хвіліну, праходзяць каля гандлёвых кветкавых радоў, бачу безнадзейна сумныя вочы дзяўчат, якія праводзяць поглядам кожны кошык з кветкамі. Ружы, гваздзікі, касачы... Рознай велічыні, розных колераў... І неўзабаве прыгадваю радкі з верша І. Кобзева: «Часто девушки обижаются — мол, закон любви стал суров, парни ласковых слов стесняются и почти не дарят цветов...» Хацела б я паглядзець на таго героя, які б адважыўся падараваць каханай мільён пунсовых руж! Жартую. Вядомая справа, так толькі ў песні спяваецца. Які ж мільён, калі стыпендыя ўсяго 60 тысяч, а толькі адна ружачка каштуе тысяч 15—20?! Хочаш заляцацца да дзяўчыны — зарабляй грошы. Ёсць, напрыклад, стары студэнцкі спосаб — здаць бутэлькі. «Састарэла! — скажаш,— як «зайчык» наплакаў!» Тады ёсць магчымасць зрабіць «курсач» студэнтузамежніку або дыплом. Справа нецяжкая, і аплата ў «баксах». А пры жаданні паміж сесіямі можна ў Расію ці ў Кітай зматацца. Хочаш жыць — умей вярцецца! Народная мудрасць недарэмна кажа.

Колькі б ні было грошай, заўсёды здаецца, што іх мала. Грашовы вір круціцца ўсё хутчэй і хутчэй... І сапраўды, трэба ўмець у ім вярцецца. Каб цябе зусім не засмактала, важна адчуць, калі трэба спыніцца. Пачуцці — самае ўражлівае месца чалавечай душы. Менавіта яны першымі страчваюць магчымасць супрацiўляцца мацнеючаму з кожным днём віру. Паступова, непрыкметна страчваецца задавальненне ад падараваных кветак, ад кахання жанчын... Затое, як мы любім усё падлічваць! Выпітыя бутэлькі і колькасць набітых пасля гэтага, прабачце, морд, грошы і, нават, жанчын! А потым з гонарам і задавальненнем выхваляцца перад сябрамі, маўляў: «Курица — не птица, Польша — не заграница, женщина — не человек!»

Прыгадваюцца словы пакрыўджанай Наташы Тарасавай, вучаніцы 10-А класа СШ № 1: «Я не хачу, каб яму толькі бёдры мае былі патрэбныя! Я хачу, каб я яму патрэбна была, я!» А колькі іх, такіх жа, пакрыўджаных брудным дамаганнем, Наташ, Лен, Тань!..

Больш лянівыя «кавалеры», якія не жадаюць губляць свой час, але жадаюць жыць прыпяваючы, таксама любяць падлічваць грошы. Толькі не свае, а сваіх выбранніц. «Выбіраючы нас,— журботна кажа студэнтка IV курса Палітэхнічнага інстытута Наталля П.,— ды ў кішэню імкнуцца зазірнуць, ацэньваючы: ці не пустая?»

Невясёлы напрошваецца вывад. Чамусьці ўсё часцей дзяўчыну зараз прымаюць за рэч, да якой можна прыцаніцца. Толькі вось у вітрынах магазінаў яшчэ пакуль не выстаўляюць! Такія адносіны да дзяўчыны нават пужаюць. Таму што яна — будучая маці. За ёй будучыня. Кахаць і быць каханай ёй проста неабходна. Толькі ў атмасферы ўзаемаразумення, кахання, павагі, якая павінна цараваць ў сям'і, можна нарадзіць і выхаваць здаровае, паўнацэннае дзіця. Цікавая рэч, псіхолагі лічаць, што нават нованароджаны плача таму, што яму патрэбна ўпэўненасць у тым, што яго кахаюць. Не хачу казаць, што каханне — панацэя ад усіх хвароб грамадства. Але, на мой погляд, павелічэнне колькасці сем'яў, у якіх каханне неяк пацьмянела, стушавалася, страцілася ці не існавала наогул, прапарцыянальна павялічэнню колькасці прыроджаных дзіцячых паталогій і захворванняў.

Такім чынам, дзякуючы каханню мы забяспечваем сваю будучыню. Выбар за вамі: халодныя металічныя крылы «Montana» ці крылы кахання?!

Вольга ХАДАРЭНКА.


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

*23 чэрвеня*
*Зак. 1773.*
*Т. 1000 экз.*

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

В. а. рэдактара
Т. М. КАЗАК

*Газета падпісана ў друк у 16.00.*